# У ЗМРОЧНЫЯ ДНІ АКУПАЦЫІ

І вось насталі трывожныя і змрочныя дні акупацыі. Здаецца, зямля стагнала і плакала пад ботамі чужынцаў. Калі ж яны ўступілі ў Бераставіцу? Дакументаў, якія сведчылі б аб гэтым, пакуль што выявіць не ўдалося. Як сцвярджаў жыхар г.п. Вялікая Бераставіца І.М.Фалькоўскі, гэта было на каталіцкае свята Пятра і Паўла, якое заўсёды прыпадае на 29 чэрвеня. М.Я.Мешчаня сведчыць, што гэта быў ці то выхадны, ці то святочны дзень (29 чэрвеня ў тым годзе прыпадала на нядзелю). Іншыя старажылы-бераставічане заяўляюць, што гэта было ці то праз 5, а можа, і праз 6 дзён з пачатку вайны. Але, мусіць, застаецца фактам, што не ва ўсіх вёсках адначасова з’явіліся фашысты. Па ўсім відаць, гэта залежала ад іх месцазнаходжання, аддаленасці ад гарадоў, мястэчкаў, дарог і г.д. Л.А.Жвалеўскі добра памятаў, як у яго родных Канюхах на вясковай вуліцы з'явілася адкрытая легкавая аўтамашына з двума афіцэрамі і двума салдатамі ў суправаджэнні матацыклістаў. Праехаўшы з канца ў канец, падняўшы хмары пылу і напалохаўшы ўшчэнт жыхароў вёскі, яны спыніліся каля дома Іосіфа Панасевіча, дзе стаяла фурманка з дамашнім скарбам. Гаспадары ці то збіраліся ад’язджаць кудысьці, ці то вярнуліся толькі што дамоў. Афіцэры з закасанымі рукавамі выйшлі з машыны, падышлі да гаспадара фурманкі і спрабавалі аб чымсьці з ім загаварыць. Але адзін з іх убачыў на фурманцы сярод іншых рэчаў і сямейных фатаграфій у рамках партрэт Сталіна і спачатку аслупянеў. А потым схапіў партрэт, кінуў яго на зямлю і з раз’юшаным крыкам: «Рус, капут, Сталін капут, Беларусь капут», - пачаў таптаць яго нагамі. А потым, штосьці палапатаўшы на сваёй мове і пагражаючы пісталетам збялеламу гаспадару, яны селі ў машыну і ад’ехалі. А праз некалькі дзён прыехалі зноў назначаць старасту.

А цяпер крыху гісторыі. Яшчэ 25 мая 1940 г. Гімлер у сакрэтным дакуменце «Некаторыя думкі аб абыходжанні з насельніцтвам на Усходзе» падкрэсліваў, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі трэба разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. З гэтай мэтай прапаноўвалася расчляніць тутэйшае насельніцтва на шматлікія групы, што давала б лепшую магчымасць знішчыць адзін за адным славянскія народы. Акупацыйная палітыка павінна быць накіравана на тое, каб пераўтварыць асноўную масу акупіраванага насельніцтва ў рабоў, якія маглі б лічыць не больш як да 500, пісаць сваё імя, бесславесна падпарадкоўвацца і ведаць «Закон Божы». У распрацаваным і канкрэтызаваным нацыстамі плане «Ост» прадугледжвалася знішчэнне цэлых нацый і народаў - палякаў, яўрэяў, рускіх, украінцаў. Страшны лёс рыхтаваўся беларускаму народу: прадугледжвалася «высяленне»

(чытай: знішчэнне) 75 працэнтаў насельніцтва, а астатнія падлягалі анямечванню і выкарыстанню ў якасці рабоў. Вось чаму ўсе намаганні нямецкай прапаганды даказаць, што вайна вялася толькі супраць бальшавізма, нічога агульнага не маюць з праўдай. Вайна вялася з народамі і нацыямі, вынішчэнне якіх было асноўнай мэтай нямецкага фашызму.

Нельга абысці яшчэ адзін дакумент. Згодна з картай-схемай, датаванай 17 лістапада 1942 г., і планам на першыя 4 гады пасля завяршэння Германіяй пераможнай вайны, прадугледжвалася Беларусь ад заходняй яе мяжы да лініі Гродна - Слонім і далей па лініі Пружаны - Ганцавічы - Парычы - Рэчыца поўнасцю ачысціць ад мясцовага насельніцтва і пасяліць на ёй толькі немцаў. (Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашинстских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. Мн., 1983. Т. 1. С. 168.).

Як бачым, Бераставіччына знаходзіцца якраз да гэтай лініі і яе людзям быў прыгатаваны жорсткі лёс.

З першых дзён акупацыі фашысты імкнуліся знішчыць усё, што напамінала аб савецкім ладзе жыцця. Яны адмянілі сістэму органаў улады, савецкае заканадаўства, забаранілі сходы, дэманстрацыі. Адразу ж былі распушчаны калгасы ў раёне, адменена дзяржаўная і грамадская ўласнасць на зямлю, фабрыкі і заводы, закрыты школы, забаронены і знішчаны падручнікі.

Але чыста адміністрацыйнымі мерамі захопнікі не абмежаваліся. У першыя дні акупацыі былі расстраляны дзесяткі мірных жыхароў раёна, віна якіх была толькі ў тым, што яны былі абраны аднавяскоўцамі дэпутатамі ў мясцовыя Саветы, брыгадзірамі, членамі праўлення ці старшынямі калгасаў. Так, у першыя дні акупацыі былі расстраляны многія мірныя жыхары ў Вялікай Бераставіцы, Кавалях, Алекшыцах, Бераставічанах і іншых вёсках. Каб трымаць насельніцтва ў пастаянным страху і паслушэнстве, задушыць усякае імкненне да супраціўлення, нават думкі аб ім, гітлераўцы выдалі шмат бесчалавечных і жорсткіх інструкцый і загадаў, сутнасць якіх зводзілася да таго, каб любымі сродкамі не дапускаць супраціўлення акупантам, фізічна знішчыць не толькі непакорных, але і наогул вынішчыць значную частку нашага насельніцтва. Яны поўнасцю развязалі рукі палачам і забойцам, вызваліўшы іх не толькі ад юрыдычнай, але і маральнай адказнасці за свае злачынствы. Узаконеным пакараннем за любое праяўленне непаслушэнства, непадпарадкавання ці супраціўлення ўладам была смяротная кара. За нявыхад на работу, знаходжанне на вуліцы ў забаронены час, за праслухоўванне маскоўскіх радыёперадач, нявыплату падаткаў, за знаходжанне паблізу чыгункі і многае іншае пагражаў расстрэл.

Яшчэ задоўга да пачатку агрэсіі кіраўніцтва фашысцкай Германіі адобрыла план раздзелу захопленай Беларусі. Як сведчаць аўтары манаграфіі «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны» (Мн., 1983. Т. 1. С. 170-171), тэрыторыя Беларусі па лініі Полацк - Барысаў на ўсходзе, Старыя Дарогі - возера Чырвонае на поўдні, па рацэ Зяльвянка і ўсходняй ускраіне Белавежскай пушчы на захадзе пасля акупацыі была **вылучана ў генеральную акругу, атрымаўшую назву «Беларутэнія» (Беларусь)**. Плошча акругі складала чацвёртую частку тэрыторыі БССР з насельніцтвам 3 138 526 чалавек. Гэта генеральная акруга - разам з генеральнымі акругамі «Літва», «Латвія» і «Эстонія» - была ўключана ў рэйхскамісарыят «Остланд» з цэнтрам у г. Рыга. Паўднёвыя раёны Гомельскай і Палескай абласцей, частка Брэсцкай вобласці ўвайшлі ў рэйхскамісарыят «Украіна». Да генеральнай акругі «Літва» былі далучаны часткова тэрыторыя Ашмянскага, Смаргонскага, Астравецкага і некаторых іншых раёнаў Беларусі...

Восенню 1941 г. раздзел часова акупіраванай Беларусі быў у асноўным завершаны.

**Беластоцкая вобласць, у якую ўваходзіла і Бераставіччына, а таксама паўночныя раёны Брэсцкай вобласці (Поразаўскі, Пружанскі, Ружанскі і некаторыя іншыя), Зэльвенскі, Мастоўскі, Шчучынскі, Васілішкаўскі раёны Баранавіцкай вобласці былі вылучаны ў асобную адміністрацыйную адзінку - акругу «Беласток», якая далучалася да Усходняй Прусіі і ўваходзіла ў склад Германіі. Гэта тэрыторыя ад генеральнай акругі «Беларутэніі» аддзялялася дзяржаўнай мяжой і пагранічнай зонай са шматлікімі пагранічнымі дазорамі. Уезд і выезд за межы тэрыторыі акругі «Беласток» яе жыхарам забараняўся. У населеных пунктах была густая сетка нямецкіх гарнізонаў, паўсюдна, як спрут, распусцілі свае шчупальцы гестапа, паліцыя. Тут знаходзіліся рэзервовыя нямецкія воінскія фарміраванні, у тым ліку дывізіі, якія былі на папаўненні. На тэрыторыі акругі «Беласток» знаходзіліся лагеры ваеннапалонных і шпіталі са шматлікай яе аховай. Дзейнічала паліцыя так называемага «Беларускага камітэта». Грашовай адзінкай на тэрыторыі акругі была рэйхсмарка.**

У гарадах дзейнічалі гарадскія камісарыяты, а ў раённых (павятовых) цэнтрах - ваенныя камендатуры, зондэр-фюрэры, або нямецкія шэфы раёнаў.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне было такое ж, як і пры Польшчы: гміны, паветы, замест ваяводства - акруга. Бераставіччына адносілася ўжо не да Гродзенскага, а да Саколкаўскага павета.

У той жа час гітлераўцы стваралі бачнасць існавання нейкага «самакіравання». З гэтай мэтай у былых раёнах (паветах) ствараліся раённыя ўправы, ці, як яны называліся ў дакументах, «павятовыя» ўправы. На чале ўправы стаяў бургамістр, асабліва давераная асоба нямецкага шэфа раёна. Пасады бургамістраў упраў займалі, як правіла, прывезеныя ў абозе эмігранты або тутэйшыя фашысцкія прыслужнікі. У сельскай мясцовасці былі створаны гмінныя ўправы, якія ўзначальвалі таксама бургамістры, а ў вёсках прадстаўнікамі акупацыйнай улады з'яўляліся старасты ці часцей за ўсё ў нашай мясцовасці іх называлі «солтысамі». Варта зазначыць, што, да гонару нашых землякоў, на шлях супрацоўніцтва з акупантамі стала нязначная частка жыхароў Бераставіччыны. Устанаўленне так званага новага парадку гітлераўцы пачалі з расстрэлаў мясцовых актывістаў. Але гэтым фашысцкія каты не абмежаваліся. На працягу ўсяго перыяду акупацыі яны праводзілі сістэматычнае знішчэнне насельніцтва, у тым ліку жанчын, старых і дзяцей.

Адразу пасля акупацыі нямецка-фашысцкія захопнікі абгарадзілі калючым дротам тэрыторыю пасёлка, якая знаходзілася ў квадраце паміж сённяшнімі вуліцамі Савецкая, Леніна, Кастрычніцкая і Рабочая (тут жылі пераважна яўрэі, знаходзіліся тры сінагогі), і стварылі гета, куды сагналі яўрэяў з усёй Бераставіцы і наваколля. Для іх пражывання, як сведчыць старажыл Вялікай Бераставіцы М.С. Баер, пабудаваны былі два баракі. Адсюль іх пад аховай ганялі на працу, адсюль іх вывозілі на знішчэнне невялікімі групамі ў Крынкі і, як сцвярджаюць старажылы, у Гродна і Свіслач. Асобныя яўрэйскія сем'і жылі ў мястэчку. Казалі, што яны сумелі ўлагодзіць мясцовае нямецкае начальства і ім дазволілі пражываць па хатах, але на спіне і грудзях вопраткі павінны былі насіць жоўтыя шасціканцовыя зоркі. І хоць усе жылі прадчуваннем блізкай пагібелі, ніхто з іх і не спрабаваў схавацца, сысці куды-небудзь, выратавацца.

А вясной (іншыя жыхары сцвярджаюць, што гэта было ўвосень) 1942 г. з навакольных вёсак былі мабілізаваны мужчыны з фурманкамі, і ў той жа дзень усё яўрэйскае насельніцтва было вывезена з Вялікай Бераставіцы ў Крынкі. Як сцвярджае старажыл М.Я. Мешчаня, які быў з фурманкай таксама мабілізаваны немцамі на гэту акцыю, калона фурманак расцягнулася ад Петраўцаў да Вялікай Бераставіцы. Як сведчаць матэрыялы Дзяржаўнай камісіі па расследаванні і ўстанаўленні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у Бераставіцы знішчана 87 яўрэйскіх сямей (411 чалавек), якія былі вывезены на польскую станцыю Малкеня і там расстраляны. Думаецца, што гэта лічба недакладная, бо яўрэйскіх сямей перад вайной, сцвярджаюць старажылы, было значна больш.

Паводле матэрыялаў камісіі, усяго ў раёне знішчана 634 чалавекі, у тым ліку 112 жанчын і 219 дзяцей. Акрамя яўрэяў замучана, расстраляна, спалена беларусаў, палякаў і іншых нацыянальнасцей - 223 чалавекі.

У спісах знішчаных мірных жыхароў в. Магіляны значацца 80-гадовая Еўдакія Рыгораўна Будрык, 50-гадовая Антаніна Васільеўна Галісевіч, 28-гадовы Іосіф Антонавіч Гайса і іншыя.

Жахлівы абвінаваўчы дакумент уяўляе сабой спіс загінуўшых мірных жыхароў у в. Канюхі: расстраляны Уладзіслаў Іосіфавіч Аўдзей, Лізавета Маркаўна Аўдзей, Міхаіл Іванавіч Бандаровіч, Пётр Георгіевіч Данілоўскі і многія іншыя; спалены Міхаіл Іосіфавіч Ляховіч, Іосіф Міхайлавіч, Андрэй Міхайлавіч і Адольф Андрэевіч Ражко... Знішчалі нават сем'ямі. У в. Сямёнаўка ў 1943 г. за сувязь з партызанамі былі знішчаны сем'і Надзеі Адамаўны Гіжук (5 чалавек) і Лідзіі Іванаўны Гіжук (5 чалавек), у якіх былі дзеці па 1 - 3 гады.

У турмах і канцлагерах былі замучаны: з в. Жукевічы - Іван Іванавіч Якаўчук, з в. Эймінаўцы - Аляксей Фаміч Гладкі, Іван Пятровіч Янчэўскі, Фёдар Пятровіч Янчэўскі, з в. Падбагонікі - Раман Якаўлевіч Салавей, з в. Людвінова - Георгій Іосіфавіч і Паліна Міхайлаўна Запольскія, іх 16-гадовая дачка Марыя, 23-гадовая Анастасія Георгіеўна Шымавалос і яе трохгадовы сын Саша, з в. Леснявічы - Аляксандр Дзмітрыевіч Гулінскі...

Страшнае злачынства ўчынілі фашысцкія варвары ў в. Верхаўляны. 20 мая 1942 г. яны акружылі вёску, арыштавалі і пагналі ў Саколку, а потым і ў Беласток усіх мужчын і маладых хлопцаў, дзе іх закатавалі або расстралялі. А 20 ліпеня 1942 г. немцы зноў акружылі вёску, астаўшыхся жыхароў - жанчын і дзяцей - выгналі з дамоў, а вёску спалілі.

На Бераставіччыне праводзілася сістэматычная мабілізацыя насельніцтва на катаржныя работы ў Германію. Спачатку немцы абяцалі там «райскае» жыццё, праз газеты, лістоўкі, аб'явы агітавалі моладзь на добраахвотны выезд. «За працу ў Германіі будуць давацца: прадукты, кватэры і заработная плата ў дастатковым памеры», - пісалі яны. Але добраахвотнікаў не было.

У агітацыю нават уключылася духавенства. Архіепіскап Беластоцкай і Гродзенскай епархій Венядзікт 27 красавіка 1943 г. у адозве да праваслаўнага беларускага насельніцтва пісаў: «... вайна патрабуе не толькі ахвяр і крыві, але таксама несупыннай і напружанай работы ўсяго насельніцтва... Нам, беларусам, таксама адведзена месца ў гэтай вайне, якое можна параўнаць з жаўнерскім, гэта значыць: прадставіць у распараджэнне Германіі сваю рабочую сілу для падтрымкі тых, хто аддае сваю кроў за нашу свабоду...».

Але жадаючых на Бераставіччыне не было. І ўсе-такі на работу ў Германію былі вывезены, паводле архіўных даных той жа камісіі, 1264 чалавекі, з іх 548 жанчын. Многія з іх так і не вярнуліся, не ўбачылі роднага дома, Бацькаўшчыны. Адны загінулі ад непасільнай працы, другія - ад жорсткіх бамбёжак авіяцыі саюзнікаў.

Акупанты, якія гаспадарылі на Бераставіччыне 3 гады, разрабавалі прадпрыемствы, калгасы, амбулаторыі, школы. Яны патрабавалі ад яе жыхароў паслушэнства, увялі сістэму падаткаў, штрафаў, жорстка каралі за любое непадпарадкаванне нямецкім уладам. Але, нягледзячы на ўсе рэпрэсіўныя меры, жыхары раёна не скарыліся захопнікам, на Бераставіччыне шырылася барацьба супраць фашысцкіх акупантаў.

Мікалай Пацэнка, г.п. Вялікая Бераставіца.